500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню

**Майскі нумар літаратурна-мастацкага часопіса «Маладосць» з'явіўся ў крамах «Саюздруку» Віцебска і Полацка ў большай колькасці, чым звычайна. Нумар прысвечаны Віцебшчыне, гісторыі старажытных гарадоў Полацка і Віцебска.**

# «Маладосць» прысвечана Віцебшчыне

Празаічныя і паэтычныя старонкі прадстаўлены аўтарамі, якія нарадзіліся ў Віцебскай вобласці. Сярод іх Сяргей Шаматульскі, Алена Масла, Юлія Алейчанка, Ганна Лутава і іншыя. Цэнтральным па змесце з'яўляецца інтэрв'ю з кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржуніверсітэта, краязнаўцам, ініцыятарам і мадэратам дыскусійных заняткаў па гісторыі горада ў абласной бібліятэцы Дзянісам Юрчаком.

Цэлы раздзел тэкстаў пададзены пад загалоўкам «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт прадстаўляе». Сярод іх «Рэпартаж-экскурсія па самым старым корпусе ПДУ» ад Кацярыны Захарэвіч, «Нататкі тутэйшага этнографа» ад Уладзіміра Лобача, «Нататкі выкладчыка псіхалогіі» ад Ірыны Андрэевай, «Аляксандр Гугнін і некалькі сціплых адкрыццяў», інтэрв'ю з рэктарам ПДУ Дзмітрыем Лазоўскім, дырэктарам навуковай бібліятэкі ПДУ Марынай Шуханковай і рэдактарам універсітэцкага літаратурнага часопіса Анастасіяй Мазго.

Не абышлі Полацк і калумністы: аўтар калонкі «На адлегласці часу» Кацярына Захарэвіч напісала сваё «Прызнанне» гэтаму гораду, аўтар «Крэсак жыцця» Канстанцін Касяк расказаў пра тое, што «У лабірынце нельга рухацца назад». Акрамя таго, адзін з калумністаў «Маладосці» Ігар Палынскі – жыхар Полацка і карэспандэнт Полацкага тэлеканала «Саммit+ТБ». Ён у сваёй калонцы «па-за загалоўным» закранае ўсім вядомыя праблемы, на якія звычайна не звяртаюць увагі.

Штомесячны праект «Варштат» падае артыкулы Вольгі Філімонавай «Кнігадрук у Полацку: ад сёння да часоў піяраў і езуітаў» і Сяргея Шыдлоўскага «Кніга з Полацка: да традыцыі полацкай метагістарычнай прозы».

**Святлана ВАЛОДЗІНА**

